ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982

2

СНЕЖНЯ

ЧАЦВЕР

№ 35 (1373)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ПРЭЗІДЫУМ ПРАФКОМА

універсітэта правёў чарговае пасяджэнне, на якім абмеркаваў работу прафбюро гістарычнага факультэта з замежнымі студэнтамі. Старшыня арганізацыйна-масавай камісіі прафсаюзнага бюро геафака Л. Кручкова расказала аб арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва паміж вучэбнымі групамі факультэта.

Р. МАРЧУК,
старшыня прэс - цэнтра прафкома.

ІНТЭРПРЭС-ЦЭНТР

пачаў работу пры савеце па справах замежных навучэнцаў універсітэта. У яго састаў увайшлі студэнты факультэта журналістыкі з В'етнама, ГДР, Іарданіі, НДРЙ, Амана, Сальвадора, Сірыі, Эфіопіі і СССР. Кіраўніком інтэрпрэс - цэнтра (ІПЦ) зацверджаны старшы выкладчык кафедры рускай мовы па навучанню замежных студэнтаў асноўных факультэтаў У. Будай.

Адбылося першае пасяджэнне ІПЦ, на якім абмяркоўваліся план і асноўныя напрамкі работы цэнтра па асвятленню ў друку вучобы, быту, спартыўных і культурна - масавых мерапрыемстваў, дзейнасці зямляцтваў замежных навучэнцаў.

А. ШАРАПА,
прарэктар універсітэта.

СУСТРЭЧА

з намеснікам старшыні рэспубліканскай камісіі садзейнічання Савецкаму фонду міру, членам Саюза журналістаў СССР М. Ф. Ягоравым адбылася ў першакурснікаў хімічнага факультэта. «Не» трэцяй сусветнай вайне!»—асноўная тэма гутаркі. Студэнты яшчэ раз пераканаліся: барацьба за мір— справа ўсеагульная, асабліва сёння, калі ЗША і іх саюзнікі нарошчваюць гонку ўзбраенняў, калі над Зямлёй навісла пагроза новай сусветнай вайны.

А. СТЭФАНОВІЧ,
студэнтка хімфака.

ПЕРШЫНСТВО

ВНУ горада па спартыўнаму арыентаванню прайшло ў Радашковічах. Удзельнікам спаборніцтваў трэба было прабегчы каля 12 кіламетраў і 10 кантрольных пунктаў. Мацнейшымі аказаліся студэнты Інстытута народнай гаспадаркі, на другім месцы — студэнты Мінскага радыётэхнічнага інстытута, а трэцяе—у каманды БДУ імя У. І. Леніна.

У асабістым першынстве сярод жанчын на трэцяе месца выйшла студэнтка нашага універсітэта Тамара Волкава.

Н. МАРЦІНКЕВІЧ,
С. РАМАНАВА,
студэнткі журфака.

● ІМЯННЫ СТЫПЕНДЫЯТ

— ВОЛЬГА—ЦУДОЎНЫ ЧАЛАВЕК. З ёй надзвычай проста...

— Яна сапраўдны таварыш, да раніцы сядзець з табой можа, пакуль не растлумачыць незразумелае...

— З грамадскай работай спраўляецца добра. З яе дапамогай арганізавана шмат цікавых сустрэч, паходаў, падарожжаў...

Усе гэтыя добрыя словы— пра Вольгу Хвошч, студэнтку 3-га курса беларускага аддзялення філфака. Да ўсіх якасцей, пералічаных яе сябрамі па вучобе, дададзім: Вольга яшчэ і выдатніца, атрымлівае стыпендыю імя П. Броўкі. Сама яна лічыць, што вучыцца ёй не цяжка: да арганізаванасці і дакладнасці прывыкла яшчэ ў Полацкім педагагічным вучылішчы імя Ф. Скарыны, дзе атрымала спецыяльнасць выкладчыка пачатковых класаў, а гэта значыць, што ва універсітэт яна прыйшла ўжо з пэўным багажом ведаў.

Сёння галоўная мэта Вольгі—стаць высокаадукаваным, усебакова развітым чалавекам. Яе намаганні прыносяць плён. Сведчанне гэтага— выдатныя адказы на экзаменах, павага сяброў і выкладчыкаў.

Э. КАЛЧУНОВА,
студэнтка журфака.

На здымку: выдатніца вучобы Вольга **Хвошч.**

УРОКІ КОЛАСА

НА ДНЯХ у актавай зале філалагічнага факультэта адбыўся вечар памяці і ўшанавання Якуба Коласа, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі. У ім прынялі ўдзел выкладчыкі і студэнты факультэта, а таксама госці з іншых навучальных устаноў.

Уступнае слова сказаў дацэнт кафедры беларускай літаратуры К. Р. Хромчанка. Доктар філалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры АН БССР М. І. Мушынскі паведаміў пра дасягненні сучаснага коласазнаўства, пра перспектывы яго развіцця. Вялікую цікавасць прысутных выклікала выступленне заслужанага дзеяча культуры БССР, сына Якуба Коласа Д. К. Міцкевіча.

У гэтым годзе трэцякурснікі праходзілі дыялекталагічную практыку ў Мікалаеўшчыне. Студэнтка А. Парфіявец прачытала на вечары свае вершы, напісаныя пад ўражаннем наведання мясцін, дзе прайшлі дзіцячыя гады паэта.

І. С. Курбека, старшы навуковы супрацоўнік літаратурнага музея Я. Коласа з мяккім дасціпным гумарам прыгадаў свае сустрэчы з класікам, расказаў аб новай экспазіцыі музея. Ва ўрачыстасці прынялі ўдзел загадчыца кафедры беларускай літаратуры В. В. Казлова, члены Саюза пісьменнікаў прафесар С. Х. Александровіч, прафесар А. А. Лойка, дацэнт В. П. Рагойша і іншыя.

На канферэнцыі выступілі таксама студэнты - філолагі. «Звяртаючыся да нас, маладых, — гаварылі яны, — Якуб Колас заклікаў захоўваць роднае слова, любіць і шанаваць яго. У сваіх артыкулах, прамовах, гутарках ён настойліва падкрэсліваў неабходнасць вывучэння маладым пакаленнем гісторыі, літаратуры і культуры свайго народа».

Наша моладзь уважліва прыслухоўваецца да парад песняра і шмат чаму вучыцца ў яго. Ды і як можна не вучыцца ў такога выдатнага настаўніка? Бадай, ніхто з беларускіх пісьменнікаў не аддаваў педагагічнай дзейнасці столькі часу і сіл, як Якуб Колас. Ён настаўнічаў на Палессі, на Міншчыне, на Куршчыне, выкладаў у Беларускім педагагічным тэхнікуме і БДУ. Застаўся ён настаўнікам і ў сваіх неўміручых творах, бо шчодра дзеліцца з намі сваімі ведамі, назіраннямі, пачуццямі і думкамі аб жыцці.

Кожны з нас, колішніх абітурыентаў, прынёс у сцены універсітэта свае надзеі і трывогі, як прынёс іх калісьці на рабфак Сцёпка — галоўны герой аповесці Я. Коласа «На прасторах жыцця». Кожны з нас, як і малады настаўнік Лабановіч, задае сабе вечныя пытанні: «Хто я такі? Навошта жыву? У чым сэнс жыцця?»

Мы знаёмімся з творамі Якуба Коласа яшчэ ў пачатковай школе і звяртаемся да яго спадчыны на працягу ўсяго жыцця.

Мы вучымся ў вялікага чалавека і грамадзяніна патрыятызму і любві да свайго народа, мужнасці і сумленнасці, прынцыповасці і паслядоўнасці, жыццёвай актыўнасці і працавітасці.

Кожны новы дзень дорыць нам адкрыцці, кожны дзень мы ўзбагачаем сябе ведамі. Але сапраўды багаты той чалавек, які ўмее аддаваць. Усе мы вучымся, каб потым (дзе б мы ні працавалі) перадаваць свае веды іншым. Перадаваць гэтак жа шчодра, як Якуб Колас.

Пасля заканчэння ўрачыстай часткі дэманстраваўся дакументальны фільм «Дзядзька Якуб», створаны творчым аб'яднаннем «Летапіс».

Вечар, прысвечаны 100-годдзю вялікага сына беларускай зямлі, выліўся ў сапраўднае свята ўдзячнасці і пашаны.

У. СІЎЧЫКАЎ,
студэнт філфака.

50-годдзю

журналісцкай адукацыі ў Беларусі быў прысвечаны ўрачысты сход, які прайшоў на факультэце журналістыкі. За плённую работу па камуністычнаму выхаванню моладзі, паспяховую падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў факультэт журналістыкі ўзнагароджаны Ганаровай граматай МінВНУ БССР, а калектывы кафедр — Ганаровымі граматамі рэктарата. Узнагароды ўручыў рэктар універсітэта акадэмік АН БССР У. А. Белы.

І. ВАЛАСЕВІЧ.

Сустрэча з журналістамі

МІНСКІ ГАРКОМ КПБ правёў прэс-канферэнцыю для журналістаў «Мінскай праўды», «Вячэрняга Мінска», шматтыражных газет і мясцовага радыё. Тэма канферэнцыі — «Другому году пяцігодкі — ударны фініш, 60-годдзю ўтварэння СССР — дастойную сустрэчу».

На сустрэчы з журналістамі прысутнічалі члены бюро і загадчыкі аддзелаў гаркома партыі, старшыня і намеснікі старшыні Мінгарвыканкома, кіраўнікі службаў, ідэалагічных арганізацый, устаноў горада, а таксама сакратары райкомаў КПБ, што ведаюць пытаннямі ідэалогіі.

На прэс-канферэнцыі першы сакратар Мінскага гаркома КПБ Г. Г. Барташэвіч расказаў пра дасягненні мінчан у другім годзе адзінаццатай пяцігодкі, аб ходзе ўдарнай працоўнай вахты ў гонар 60-годдзя ўтварэння СССР.

Г. Г. Барташэвіч засяродзіў увагу ўдзельнікаў канферэнцыі на задачах, якія стаяць перад гарадской партыйнай арганізацыяй, працоўнымі горада, работнікамі сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды па паспяховаму завяршэнню заданняў юбілейнага года, выкананню рашэнняў лістападаўскага Пленума ЦК КПСС, праінфармаваў журналістаў аб масава-палітычных мерапрыемствах, прысвечаных юбілею краіны, што праводзяцца ў горадзе.

ТВАЯ АКТЫЎНАЯ ЖЫЦЦЁВАЯ ПАЗІЦЫЯ

Як пазбегнуць нуды і фармалізму? Адкуль бярэцца абыякавасць? Як змагацца з пасіўнасцю? Што значыць быць на перадавой? Як стаць сапраўдным калектывам? І наогул, якім павінна быць студэнцкае жыццё?

Гэтыя пытанні ўзніміліся ў шэрагу газетных артыкулаў. Сёння ў размову ўключыліся самі студэнты. Яны аналізуюць прычыны, дзеляцца думкамі, прыводзяць прыклады з жыцця сваіх груп, курсаў, прапануюць рашэнні, ставяць свае пытанні...

Нечакана атрымалася, што размова выйшла за рамкі абмеркавання ўласных, часта дробных, недахопаў і пралікаў. У цэнтры ўвагі стаяць пытанні актыўнай жыццёвай пазіцыі студэнцтва, асабістай адказнасці кожнага за агульную справу.

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ АТЭСТАЦЫЯ

У КАМСАМОЛЬСКІХ ГРУПАХ універсітэта праходзіць грамадска - палітычная атэстацыя. Камсамольцы трымаюць перад сваімі таварышамі адказ за вучобу і грамадскую дзейнасць. Прынцыпова і патрабавальна прайшоў залік у трэцяй групе трэцяга курса геаграфічнага факультэта.

НА ЗДЫМКАХ: атэстацыйная камісія за работай; на пытанні адказвае Вольга Шырокава.

Фота **В. Шачака.**

«Прычына — у нас саміх»

— Ну як, рабяты, у які музей вырашылі пайсці!

— Ведаеш, ніхто нікуды не хоча...

Прымаць удзел у гэтым дыялогу мне давялося зусім нядаўна. Чаму так атрымліваецца — не сталенне, а якоесьці старэнне душы?! А нам толькі васемнаццаць-дваццаць! Няўжо мы паступілі ва універсітэт з жаданнем усе пяць гадоў «прасядзець» у цішыні?! Так жыць нельга! Калі гадоў праз дваццаць-трыццаць нашы дзеці папросяць расказаць пра студэнцкае жыццё, ці многа зможам мы ім сказаць? Думаю, што не вельмі. Мы ў групе спрабавалі знайсці прычыну пасіўнасці нашага калектыву, але ў большасці выпадкаў прычына гэтая ў нас саміх.

Успомніўся мне выпадак з будатрадаўскага жыцця. Аднойчы, у хвіліну шчырасці, адна з дзяўчат прызналася, што ёй нецікава ў атрадзе, дарэчы, адным з лепшых на факультэце. А справа, з яе пункту гледжання, у тым, што яна нічога не ведае аб мінулым атрада, яго традыцыях. Але чаму яна не ведала нічога, а я — шмат што, хоць таксама была ў атрадзе ўпершыню? Прычына ў тым, што мне было сапраўды цікава ўсё, я не саромелася распытваць, не абмяжоўвалася афіцыйнай інфармацыяй аб гісторыі атрада. Можа таму «старычкі» ахвотней гутарылі са мной. А яна так і засталася «заклінаванай» у сваіх уласных інтарэсах і таму нецікавай для акружаючых...

Пасля будатрада я добра зразумела: актыўнасць — гэта не гучныя фразы наконт творчага гарэння, сапраўдная актыўнасць праяўляецца штодзённа ў самых, на першы погляд, будзённых справах.

Цяпер я ўсё часцей задумваюся над тым, што перашкаджае жыць заўсёды напружана, цікава? Можа, няўменне разлічваць свае сілы, можа, пераацэнка ўласных здольнасцей, а можа, і адсутнасць шчырасці?.. Нешта атрымліваецца, як і задумала, іншае — зусім наадварот. Як знайсці аптымальны варыянт?

Л. АЛЯКСАНДРАВА,
студэнтка мехмата.

«Патрэбна шчырая размова»

ХАРАКТЭРНАЯ РЫСА студэнцкага калектыву — гэта, перш за ўсё, узаемаразуменне. Безумоўна, студэнцкаму братэрству ўласцівы і добры гумар, і тонкая іронія, і цікавасць да ўсяго новага. Тое, што называецца сапраўдным студэнцкім жыццём, заключае ў сабе як жаданыя поспехі, так і нечаканыя перашкоды, цяжкасці, але ўсё гэта ўрэшце павінна прывесці да станаўлення характару.

У асноўным перыяд адаптацыі праходзіць на першым годзе навучання. Наш першы курс ужо стаў, як кажуць, здабыткам гісторыі. Што запомнілася? Безумоўна, «бульба» і мы ўсе — незнаёмыя, крыху разгубленыя, усхваляваныя. А потым — павольнае, і такое цікавае спазнаванне. Не ўсё было гладка: паяўляліся і так званыя «групіроўкі», еднасць нараджалася не адразу, але — нараджалася: у немудрагелістых клубах вясёлых і знаходлівых, у днях нараджэнняў, «агеньчыках», проста у тым, што збіраліся разам паслухаць музыку, паразмаўляць і ўбачыць вочы адзін аднаго...

Аднак як ні прыемныя ўспаміны, — жыццё не ў іх. Жыццё, яно ў пераадоленні. І без цяжкасцей нельга — нецікава. Існаваць — справа няхітрая, але надта ж нудная. Дык як жа навучыцца жыць разам? Усе мы розныя. У кожнага—свой асабісты «мірок». З чаго пачаць? Можа, якраз з пераадолення гэтых самых «міркоў», са шчырага імкнення зразумець таварыша па групе?

Калі ўявіць сабе ідэальны калектыў, то першае, што будзе яму ўласціва, — гэта творчыя адносіны паміж людзьмі; асноўнай мэтай існавання стане ўзаемаўзбагачэнне, а плённая праца — як вынік. Але гэта ў ідэале.

Я лічу, што раз'яднанасць у студэнцкім калектыве ў значнай ступені залежыць ад розніцы ва ўзроўні ведаў. «Эрудыты» паблажліва ставяцца да астатніх, «астатнія» ж злуюць «эрудытаў» «элементаршчынай» сваіх думак. А як прыемна, калі побач большасць упэўненых у сабе, цікавых, дасціпных студэнтаў! Хто не марыць пра гэта?

Высокі ўзровень агульнай культуры расшырае не толькі ўласны кругагляд, ён дазваляе не абмяжоўвацца ў студэнцкіх размовах абмеркаваннем модных навінак і дасягненняў сучаснай музыкі... Здавалася б, справа зразумелая: імкніся быць цікавым, з разнастайнымі інтарэсамі чалавекам, і табе і з табой сумна не будзе. Але, як гэта ні парадаксальна, такія імкненні паяўляюцца далёка не ў кожнага. Што ж рабіць? Няўжо пяць студэнцкіх гадоў запомняцца толькі тым, як, з аднаго боку, прыходзілася «ратаваць» на кантрольных і экзаменах «тонучых», а з другога — дрыжаць: раптам сам не паспееш спісаць? Сумна, ці не так? Як з гэтым змагацца, дакладна не ведаю, але разумею, што шчырая размова патрэбна неадкладна.

У. ХАРОШКА,
студэнт мехмата.

«Дайце кіраўніка!»

ПАСІЎНАСЦЬ. Чаму і калі яна нараджаецца? Мусіць, яшчэ ў школе ці нават раней. У дзіцячым садзе — выхавацелі, у школе — класныя кіраўнікі, дома — бацькі. І ўсе робяць так, каб табе было лягчэй і весялей жыць. Прыдумваюць нешта цікавае, даюць нейкія даручэнні (і часцей за ўсё самі ж іх за цябе выконваюць). Адным словам, цалкам пазбаўляюць самастойнасці. А ў выніку падлеткі ўжо не здольны прыдумаць нешта арыгінальнае, незвычайнае, ды і не жадаюць гэтага рабіць. Адказнасці ніякай не адчуваюць, бо яна проста не выхавана. Але рысы гэтыя — несамастойнасць, безадказнасць — пачатак, далей паяўляюцца безыніцыятыўнасць, пасіўнасць, абыякавасць. І не толькі ў грамадскіх справах — ва ўсім. А гэта ўжо небяспечна.

Бруна Ясенскі казаў: «Не бойся ворагаў — у горшым выпадку яны могуць цябе забіць. Не бойся сяброў — у горшым выпадку яны могуць табе здрадзіць. Бойся абыякавых, іменна з іх раўнадушнай згоды чыняцца самыя страшныя справы на зямлі».

Як змагацца з гэтымі рысамі? Я лічу, што моладзі неабходна даваць больш самастойнасці, і перш за ўсё трэба зацікавіць яе грамадскімі справамі, абудзіць фантазію. Зрабіць гэта можна, толькі прапанаваўшы нешта цікавае, новае, бо ўсе звычайныя мерапрыемствы проста надакучылі. Вядома, тут патрэбны кіраўнік, але ён павінен аддавацца сваёй справе да канца, рабіць усё з душой, а не для «галачкі» ў плане. Тады можа нават паявіцца нейкі элемент спаборніцтва: кожны прапануе сваё і сам гэта зробіць. А ўсім вядома: тое, што зрабіў самастойна, заўсёды будзе цікавейшым і даражэйшым. Калі працуеш сам, абуджаецца цікавасць да справы, а гэта ўжо задатак актыўнасці.

В. ЖАРЫНА,
студэнтка журфака.

БОЛЬШ ЗА СОРАК гадоў жыцця Мікалая Тарасавіча Раманоўскага звязаны з універсітэтам і геаграфічным факультэтам, які ён узначальвае амаль 30 гадоў.

Мікалай Тарасавіч Раманоўскі — член КПСС з 1939 года, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, актыўны ўдзельнік партызанскага руху ў Беларусі, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі. Доблесная, шматгадовая праца прафесара М. Т. Раманоўскага адзначана высокімі ўзнагародамі — ордэнам Дружбы народаў, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Яму прысвоена званне «Заслужаны работнік вышэйшай школы».

Напярэдадні сямідзесяцігоддзя жадаем Мікалаю Тарасавічу новых творчых поспехаў.

ПЕРАМОГ ТАЛЕНТ ДРУЖБЫ

НЕ ЗМАЎКАЕ ў студэнтаў-першакурснікаў юрыдычнага факультэта размова аб конкурсе мастацкай самадзейнасці акадэмічных груп.

Надоўга застануцца ў памяці дні падрыхтоўкі да конкурсу, трывожныя мінуты выступленняў і ўсепераможнае пачуццё дружбы, адзінства, якое захапіла ўсіх і кожнага. Для юнакоў і дзяўчат гэта не проста конкурс на талент спяваць, танцаваць, чытаць вершы. Спаборнічалі ў большым — ва ўменні дружыць, разам радавацца і перажываць, разам вучыцца і адпачываць, разам змагацца і перамагаць. У гэтым спаборніцтве правяраўся зусім юны, у буднях і святах народжаны, загартаваны і праверaны калектыў.

Трэба было бачыць, як усе хваляваліся, як рваліся на сцэну, каб дапамагчы таварышу, і як радаваліся, калі атрымліваўся цікавы і арыгінальны нумар. З твораў гледачоў-старшакурснікаў не сыходзілі добрыя ўсмешкі.

Перад вачамі прамільгнулі першыя крокі студэнцкага жыцця. Прыпомнілі далёкі і блізкі час уступных экзаменаў, шчаслівае першае верасня, а за ім — незабыўную першую «бульбу» з полем без канца і краю. Не засталіся без увагі і надзённыя праблемы сённяшняга дня.

Зразумела, усе стараліся, як маглі, але перамаглі калектывы, у якіх умацавалася сапраўдная студэнцкая дружба. Яна прынесла перамогу першай, пятай і другой групам.

Т. ЧАЙКОЎСКАЯ,
студэнтка юрфака,
слухачка аддзялення журналістыкі ФГП.

Неўміручы подзвіг Сталінграда

ЁСЦЬ ПАДЗЕІ, якія непадуладны часу. Да іх адносіцца і бліскучая перамога савецкага народа і яго Узброеных Сіл у Сталінградскай бітве, саракагоддзе якой адзначаюць зараз усе савецкія людзі, усё прагрэсіўнае чалавецтва.

Гэтую бітву з поўным правам называюць бітвай веку. Сталінград навечна ўвайшоў у гісторыю як сімвал непераможнасці Савецкага Саюза. Яна ўнесла рашаючы ўклад у дасягненне карэннага пералому ў ходзе другой сусветнай вайны, прадвызначыла непазбежнае паражэнне гітлераўскай Германіі і ўсяго блоку фашысцкіх дзяржаў.

Перамога ў Сталінградскай бітве была вынікам непахіснай стойкасці, мужнасці і масавага гераізму савецкіх войск, самаадданай працы савецкіх людзей у тыле, бяспрыкладнага подзвігу партызан і падпольшчыкаў.

Выдатная перамога пад Сталінградам паказала ўзросшую магутнасць Чырвонай Арміі і яе высокае ваеннае майстэрства. У ходзе Сталінградскай бітвы былі выдатна ажыццёўлены стратэгічныя абарончыя, а затым наступальныя аперацыі групы франтоў з мэтай акружэння і знішчэння вялікай групоўкі ворага. Гісторыя войнаў яшчэ не ведала аперацый такога маштабу.

Сталінградская бітва была самай працяглай па часу. 200 дзён і начэй на подступах да Сталінграда і ў горадзе ішлі жорсткія баі.

Карыстаючыся адсутнасцю другога фронту ў Еўропе, гітлераўскае камандаванне з мэтай выхаду ў нафтавыя раёны Каўказа, ва ўрадлівыя раёны Дона, Кубані, Ніжняй Волгі сканцэнтравала на паўднёвым крыле савецка-германскага фронту вялікую групоўку сваіх войск.

Бітва за Сталінград пачалася 17 ліпеня. У гэты дзень перадавыя атрады 62-й арміі ўступілі ў бой з часцямі ворага, якія падышлі да рэчкі Чыр, прымусілі галоўныя сілы ворага спыніць свой рух наперад. Савецкае камандаванне выйграла час для ўмацавання абароны, для будаўніцтва чатырох абарончых абводаў на подступах да Сталінграда.

У сваю чаргу і гітлераўскае камандаванне ўмацавала сваю 6-ю армію. Да 22 ліпеня яна мела 18 дывізій і разгарнула барацьбу за галоўную паласу абароны 62-й і 64-й савецкіх армій. Вораг спрабаваў ударыць па флангах савецкіх войск у раёне Дона, акружыць і знішчыць іх, выйсці ў раёне Калача і з захаду прарвацца да Сталінграда.

Аднак у выніку ўпартай абароны 62-й і 64-й армій і контрударaў злучэнняў 1-й і 4-й танкавых армій задума ворага была сарвана. Да 10 жніўня савецкія войскі змаглі адысці на левы бераг Дона і спыніць ворага, заняўшы абарону на знешнім абводзе Сталінграда.

Нямецка - фашысцкае камандаванне вымушана было павярнуць з каўказскага на сталінградскі напрамак 4-ю танкавую армію. Гэта стварыла пагрозу прарыву да Сталінграда танкавых злучэнняў ворага.

З саставу Сталінградскага фронту быў выдзелены новы, Паўднёва - Усходні фронт (камандуючы А. І. Яроменка). Войскі Паўднёва - Усходняга фронту нанеслі контрудар і вымусілі 4-ю танкавую армію ворага часова заняць абарону. 19 жніўня дзве ўдарныя групоўкі гітлераўцаў зноў перайшлі ў наступленне. У выніку трохдзённых жорсткіх баёў вораг фарсіраваў Дон у раёне Вярцячага. Вечарам 23 жніўня перадавыя часці 6-й нямецкай арміі выйшлі к Волзе на паўночным захадзе ад Сталінграда.

Вораг спрабаваў уварвацца ў горад праз паўночную ўскраіну. 23 жніўня варожая авіяцыя падвергла Сталінград жорсткай бамбардзіроўцы, ажыццявіўшы каля 2 тысяч самалётавылетаў. У паветраных баях над горадам савецкія лётчыкі збілі 120 варожых самалётаў.

Прарыў ворага да Волгі яшчэ больш ускладніў становішча абаронцаў горада. Прымаліся энергічныя меры па эвакуацыі з горада грамадзянскага насельніцтва, па арганізацыі работы прамысловых прадпрыемстваў у франтавых умовах.

28 верасня Сталінградскі фронт быў перайменаваны ў Данскі (камандуючы генерал К. К. Ракасоўскі), а Паўднёва-Усходні — у Сталінградскі (камандуючы генерал А. І. Яроменка). 15 кастрычніка 1942 года на вузкім участку фашысты прарваліся да Волгі, у раёне Сталінградскага трактарнага завода. 11 лістапада яны выкарысталі апошнюю спробу авалодаць горадам — наблізіліся да Волгі на поўдзень ад завода «Барыкады».

18 лістапада 1942 года закончыўся абарончы перыяд Сталінградскай бітвы. За гэты час нямецка - фашысцкія войскі страцілі каля 700 тыс. забітымі і параненымі, звыш 2 тыс. гармат і мінамётаў, больш за 1 тыс. танкаў, звыш 1,4 тыс. баявых і транспартных самалётаў. План гітлераўскага камандавання, разлічаны на хуткі захоп Сталінграда, а таксама план усёй летне-асенняй кампаніі 1942 года быў сарваны. Савецкія воіны, праявіўшы непахісную волю і стойкасць у абароне, высокае воінскае майстэрства і масавы гераізм, абяскровілі галоўную групоўку ворага, якая дзейнічала пад Сталінградам, стварылі спрыяльныя ўмовы для пераходу ў контрнаступленне.

План контрнаступлення пад Сталінградам савецкае камандаванне распрацавала яшчэ ў ходзе абарончых аперацый. Важную ролю ў яго распрацоўцы сыгралі прадстаўнікі Стаўкі генералы Г. К. Жукаў і А. М. Васілеўскі. Задума контрнаступлення была ў тым, каб ударамі з плацдармаў на Доне ў раёне Серафімовіча і Клецкай і з раёна Серпінскіх азёр разграміць войскі, што прыкрывалі флангі ударнай групоўкі ворага і, развіваючы контрнаступленне, акружыць і знішчыць яго галоўныя сілы, якія дзейнічалі непасрэдна пад Сталінградам.

К пачатку контрнаступлення на сталінградскім напрамку былі разгорнуты войскі Паўднёва-Заходняга (камандуючы генерал Н. Ф. Ватуцін), Данскога (генерал К. К. Ракасоўскі) і Сталінградскага (генерал А. І. Яроменка) франтоў. Контрнаступленне пачалося 19 лістапада ўдарамі войск Паўднёва-Заходняга і 65-й арміі Данскога франтоў. Войскі Сталінградскага фронту пачалі наступленне 20 лістапада і ў першы дзень прарвалі абарону ворага і забяспечылі ўвод у прарыў 13-га танкавага, 4-га механізаванага і 4-га кавалерыйскага карпусоў.

23 лістапада войскі Паўднёва - Заходняга і Сталінградскага франтоў злучыліся ў раёне Калача, акружылі 22 дывізіі і больш за 160 асобных часцей 6-й і часткова 4-й танкавых нямецкіх армій агульнай колькасцю 330 тыс. чалавек. Былі створаны суцэльныя ўнутраны і знешні франты акружэння.

Поспех контрнаступлення забяспечылі: правільны выбар напрамку галоўнага ўдару і моманту пераходу войск для наступлення, скрытнасць падрыхтоўкі аперацыі, умелыя дзеянні войск у ходзе наступлення, дакладнае ўзаемадзеянне паміж франтамі і арміямі, адначасовае і хуткае стварэнне ўнутраных і знешніх франтоў акружэння, паспяховае развіццё контрнаступлення на знешнім фронце. У ходзе контрнаступлення пад Сталінградам упершыню ў Вялікай Айчыннай вайне было ажыццёўлена ў поўным аб'ёме артылерыйскае наступленне, а дзеянні авіяцыі ўпершыню прынялі форму авіяцыйнага наступлення.

12 снежня нямецка-фашысцкае камандаванне спрабавала дэблакіраваць свае акружаныя войскі ўдарам з раёна Кацельнікаўскага. Аднак нямецкія танкавыя дывізіі былі спынены, а затым разгромлены.

Савецкае камандаванне прыступіла да ліквідацыі акружаных пад Сталінградам нямецка - фашысцкіх войск сіламі Данскога фронту. Пасля адхілення ворагам прапановы аб капітуляцыі 10 студзеня 1943 года войскі гэтага фронту перайшлі ў наступленне, 26 студзеня воіны 21-й арміі злучыліся на Мамаевым Кургане з войскамі 62-й арміі. Варожая групоўка была раздзелена на дзве часткі. 31 студзеня спыніла супраціўленне паўднёвая група войск 6-й арміі на чале з генерал - фельдмаршалам Паўлюсам, а 2 лютага капітулявала паўночная. Войскі Данскога фронту з 10 студзеня да 2 лютага 1943 года ўзялі ў палон 91 тыс. салдат і афіцэраў ворага, каля 140 тыс. было знішчана ў ходзе наступлення.

Так закончылася Сталінградская бітва — адна з буйнейшых у другой сусветнай вайне. Фашысцкі блок у ходзе яе страціў забітымі, параненымі, палоннымі каля 1,5 млн. салдат і афіцэраў—чацвёртую частку сваіх сіл, якія дзейнічалі на савецка-германскім фронце.

У ліку абаронцаў Сталінграда былі супрацоўнікі і выкладчыкі нашага універсітэта: Н. І. Ахрамовіч, Р. І. Брагін, Т. А. Воднеў, М. К. Гарбачоў, В. С. Ямелін, А. В. Яракшын, М. П. Іваноўскі, М. В. Лапша, А. І. Ляўко, В. М. Ламавы, М. А. Майракаў, І. Ф. Музыка, М. С. Мікіценка, В. Р. Абадоўскі, А. М. Папова, М. В. Прылепка, П. З. Савачкін, Ф. Ф. Церашонак, Р. М. Трухноў, Л. А. Царанкоў, М. М. Шары, І. І. Шаціла, І. А. Юхо і іншыя.

Многія з іх, нягледзячы на ўзрост і стан здароўя, і зараз паспяхова працуюць, удзельнічаюць у грамадскай рабоце. Пажадаем ім новых поспехаў у працы, вялікага асабістага шчасця. З 40-годдзем вялікай перамогі пад Сталінградам, дарагія баявыя таварышы!

І. МАРЧАНКА,
старшыня савета ветэранаў вайны універсітэта.

ФОТАРЭПАРТАЖ

Будзьце здаровы!

У КАЛІДОРАХ ГЭТАГА памяшкання ні на хвіліну не сціхае шум. Штодзённа, штохвілінна людзям патрэбны хуткая дапамога, цеплыня і ўвага. І студэнты прыходзяць сюды, ва універсітэцкую паліклініку. Добрыя, працавітыя людзі ў белых халатах знімуць боль, параяць, дапамогуць. Залатыя рукі ў гэтых жанчын...

Я сяджу ў кабінеце загадчыцы паліклінікі Марыі Іосіфаўны Цырульнікавай:

— **Паліклініка была адкрыта пры універсітэце ў 1971 годзе з мэтай паляпшэння медыцынскага абслугоўвання студэнтаў. Яна з'яўляецца аддзелам 6-й паліклінікі 3-га клінічнага аб'яднання.**

Мы абслугоўваем студэнтаў дзённага навучання, замежных студэнтаў, а таксама ў перыяд сесіі — завочнікаў. Усяго ў нас на ўліку 9647 савецкіх студэнтаў і 888 замежных грамадзян.

Даведаўся, што ў паліклініцы працуюць чатыры ўрачы - тэрапеўты. Дапамогу студэнтам аказваюць і вузкія спецыялісты — ларынголаг, неўрапатолаг, акуліст, хірург, стаматолаг. Усе яны працуюць у спецыяльных кабінетах. Да паслуг урачоў і студэнтаў таксама ін'екцыйны кабінет, фізіятэрапеўтычная і клінічная лабараторыі, асобны кабінет для медыцынскага нагляду за спартсменамі.



— А што робіцца, калі хвораму патрэбна працяглая медыцынская дапамога? — пытаю ў Марыі Іосіфаўны.

— **Кваліфікаваную дапамогу да поўнага выздараўлення студэнту акажуць у бальніцы. Штогод адпачываюць і лечацца ва універсітэцкім прафілакторыі каля 900 чалавек. За мінулы год у санаторыі было накіравана 59 чалавек, у дамы адпачынку — 105, адпачылі на турбазах — 111.**

Цікава даведацца, што самыя распаўсюджаныя захворванні сярод студэнтаў універсітэта — прастудныя. Часцей у паліклініку звяртаюцца першакурснікі. Менш за іншых хварэюць хімікі, а больш за ўсіх — студэнты гістфака.



— **Аднак гэта тлумачыцца часткова тым, — гаворыць Марыя Іосіфаўна, — што на факультэце строгая вучэбная дысцыпліна, і каб апраўдаць пропускі заняткаў, студэнты «хварэюць» і ідуць за даведкай. Мы будзем вельмі рады, калі ўсе юнакі і дзяўчаты будуць здаровыя, радзей будуць звяртацца да нас за дапамогай.**

Будзьце заўсёды здаровы!

НА ЗДЫМКАХ: У кабінеце № 37 дапамогу студэнту з Іарданіі аказваюць урач Нэлі Ільінічна Гарулёва і медсястра Вольга Макараўна Вайцянкова; ідзе медыцынскі агляд першакурснікаў; самая малодшая ў працоўным калектыве медыкаў —фельчар-лабарант Жанна Трухан штодзённа праводзіць дзесяткі аналізаў.

В. ШАЧАК.
Фота аўтара.

ДА 60-ГОДДЗЯ ЎТВАРЭННЯ СССР

ПЕРШЫ РАСІЙСКІ

ГІСТОРЫЯ старэйшага расійскага універсітэта неаддзельная ад гісторыі краіны. Здзейснілася прадбачанне геніяльнага рускага вучонага Міхаіла Ламаносава: створаны ім Маскоўскі універсітэт стаў цэнтрам навуковай, перадавой грамадскай думкі. Імёны выхаванцаў універсітэта прагучалі на ўвесь свет. Іх справы і здзяйсненні адносяцца да вышэйшых каштоўнасцей чалавечай культуры. У Маскоўскім універсітэце вучыліся паэты і пісьменнікі, якія праславілі рускую літаратуру, выдатныя вучоныя, грамадскія дзеячы, зачынальнікі рускага рэвалюцыйнага руху, саратнікі заснавальніка савецкай дзяржавы У. І. Леніна. Лаўры першаадкрывальнікаў належаць бліскучай плеядзе даследчыкаў Маскоўскага універсітэта, навуковыя адкрыцці якіх увайшлі ў залаты фонд сусветнай навукі.

Пачуццё грамадскай сталасці заўсёды было ўласціва тым, хто вучыўся і працаваў у Маскоўскім універсітэце. Тым, хто даказаў свой патрыятызм у гады выпрабаванняў, якія выпалі на долю нашай Радзімы. Свята захоўваецца памяць аб подзвігах прафесараў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў МДУ, якія абаранялі сваю краіну, свой універсітэт у гады Вялікай Айчыннай вайны. Ад пакалення да пакалення перадаюцца традыцыі вернасці ідэалам Кастрычніцкай рэвалюцыі, якая адкрыла перад Маскоўскім універсітэтам новыя гарызонты, дала народу вялікае права — права на адукацыю.

Навукова-тэхнічны прагрэс нашай краіны абапіраецца на мацнейшы патэнцыял галоўнай ВНУ краіны — Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта: 275 кафедр, 360 лабараторый, 4 навукова-даследчыя інстытуты. 12 вучоных МДУ былі ўдастоены Дзяржаўных прэмій толькі за 1981 год.

Выконваючы свой абавязак перад партыяй і народам, калектыў МДУ ажыццяўляе падрыхтоўку спецыялістаў высокай кваліфікацыі, умацоўвае супрацоўніцтва з вытворчасцю, садзейнічае хутчэйшаму развіццю народнай гаспадаркі.

Узлёт — толькі так можна ахарактарызаваць шлях развіцця універсітэта. Імкне ўвысь універсітэцкі шпіль. Ён падобен вечнаму руху наперад. Увесь час Маскоўскі універсітэт талентам людзей, якія аддалі яму лепшае ў сваім жыцці, сцвярджаў веліч чалавечага розуму, стваральную сілу чалавека.

МДУ: лічбы і факты

Маскоўскі універсітэт гасцінна расчыніў свае дзверы для усіх народаў Савецкай краіны. 28 тысяч студэнтаў і 4,5 тысячы аспірантаў з'яўляюцца прадстаўнікамі 70 нацыянальнасцей СССР. Яны вучацца на 17 факультэтах.

У МДУ працуе каля 3,5 тысячы прафесараў і выкладчыкаў, якія прадстаўляюць 28 нацыянальнасцей Савецкага Саюза.

За 227 гадоў свайго існавання Маскоўскі універсітэт падрыхтаваў звыш 180 тысяч спецыялістаў, з іх каля 140 тысяч —за гады Савецкай улады.

З кожным годам расшыраюцца міжнародныя сувязі МДУ. Больш тысячы студэнтаў і 650 аспірантаў са 100 краін свету праходзяць у МДУ поўны курс адукацыі.

Калектыўны карэспандэнт— рэдакцыя газеты «Московский университет».

НАША ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

ЯК АБАРАНЯЦЦА

Юрыдычная кансультацыя «Адпор мае права даць кожны», надрукаваная ў нашай газеце 18 сакавіка 1982 г., выклікала ў чытачоў вялікі інтарэс. Некаторыя з іх звярнуліся ў рэдакцыю з просьбай расказаць больш падрабязна аб тым, што падразумяваецца пад перавышэннем межаў неабходнай абароны, якое прызнаецца злачынствам і можа цягнуць крымінальную адказнасць. На гэтае пытанне адказвае студэнт 5-га курса юрыдычнага факультэта В. САКАЛОЎ.

ПАСТАНОВА пленума Вярхоўнага суда СССР ад 4 снежня 1969 г. тлумачыць, што перавышэнне межаў неабходнай абароны будзе ў тым выпадку, калі «той, хто абараняецца, ужыў для абароны такія сродкі і метады, выкарыстанне якіх не выклікалася ні характарам і небяспечнасцю замаху, ні рэальнымі абставінамі, і без неабходнасці прычыніў таму, хто замахваўся, цяжкае пашкоджанне». Перавышэнне межаў дазволенай абароны з'яўляецца грамадскай небяспечнасцю і таму караецца.

У судовай практыцы найбольш часта сустракаецца такі від перавышэння, як празмернасць абароны.

Вечарам Рыжкін са сваім таварышам Чыстовым слухалі музыку. Да іх падышлі п'яныя Гараўскі і Ганін і сталі абражаць Чыстова і Рыжкіна. Гараўскі ўдарыў Чыстова. У адказ на гэта Чыстоў стаў біць Гараўскага, і той упаў. Калі Гараўскі падняўся, Рыжкін ударыў яго драўляным брусам па галаве. Ад атрыманых цялесных пашкоджанняў Гараўскі на наступны дзень памёр.

У гэтым выпадку Рыжкін учыніў забойства пры перавышэнні межаў неабходнай абароны. Перавышэнне межаў неабходнай абароны можа выявіцца таксама ў прычыненні цяжкага пашкоджання нападаўшаму адразу пасля замаху, калі той, хто абараняецца, яшчэ знаходзіцца пад уздзеяннем гэтага нападу і таму кіруецца не матывам помсты, а матывам абароны.

Напрыклад, той, хто абараняўся, прычыніў цяжкае пашкоджанне злачынцу, працягваючы абарону пасля таго, як ад папярэдняга абарончага дзеяння нападаючы ўпаў і таму спыніў нападзенне. Аднак, як растлумачыў пленум Вярхоўнага суда СССР, неабходна мець на ўвазе, што пераход зброі з рук нападаўшага ў рукі таго, хто абараняўся, і выкарыстанне яе не можа без уліку канкрэтных абставін справы разглядацца як перавышэнне межаў неабходнай абароны. «Вырашаючы пытанне аб наяўнасці ці адсутнасці прыкмет перавышэння межаў неабходнай абароны, суды не павінны механічна зыходзіць з патрабаванняў суразмернасці сродкаў абароны і сродкаў нападзення, а павінны ўлічваць як ступень і характар небяспекі, што пагражалі таму, хто абараняўся, так і яго сілы і магчымасці.

Пры вырашэнні гэтага пытання неабходна ўлічваць і тое, што ў выпадку хвалявання, выкліканага нападзеннем, яго нечаканасцю, той, хто абараняецца, не заўсёды можа ўзважыць характар небяспекі і выбраць суразмерныя сродкі абароны, што, зразумела, можа прывесці да цяжкага выніку, за які ён не нясе адказнасці».

Нядаўна групе супрацоўнікаў універсітэта ўручаны атэстаты вучоных званняў:

дацэнта па кафедры гісторыі КПСС кандыдату гістарычных навук Т. Я. ГАЛКО;

дацэнта па кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў кандыдату гістарычных навук Л. П. СУШКЕВІЧ;

дацэнта па кафедры тэарэтычнай механікі кандыдату фізіка-матэматычных навук В. М. ВЯРВІЛЬСКАЙ.

дацэнта па кафедры неарганічнай хіміі кандыдату хімічных навук Т. М. ВАРАБ'ЁВАЙ;

старэйшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «фізічная хімія» кандыдату хімічных навук Т. В. ГАЕЎСКАЙ;

дацэнта па кафедры тэарэтычных асноў радыётэхнікі кандыдату тэхнічных навук М. У. КОМАРУ;

дацэнта па кафедры аналітычнай хіміі кандыдату хімічных навук У. А. ВІНАРСКАМУ;

дацэнта па кафедры арганічнай хіміі кандыдату хімічных навук У. І. ТЫВОРСКАМУ;

дацэнта па кафедры гісторыі КПСС кандыдату гістарычных навук У. І. МЯДЗЯНІКУ;

дацэнта па кафедры гісторыі КПСС кандыдату гістарычных навук Ю. Л. КАЗАКОВУ;

ВІНШУЕМ!

дацэнта па кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў кандыдату гістарычных навук Ю. Я. ІВОНІНУ;

дацэнта па кафедры гісторыі СССР кандыдату гістарычных навук А. П. САЛЬКОВУ;

дацэнта па кафедры палітычнай эканоміі кандыдату эканамічных навук У. М. МАРХОНЬКА;

дацэнта па кафедры гісторыі КПСС кандыдату гістарычных навук В. Ф. ПРАЦКО;

дацэнта па кафедры тэарэтычнай фізікі кандыдату фізіка-матэматычных навук Г. С. ШУЛЯКОЎСКАМУ;

дацэнта па кафедры тэарэтычнай фізікі кандыдату фізіка-матэматычных навук І. Д. ФЕРАНЧУКУ;

дацэнта па кафедры тэарэтычнай механікі кандыдату фізіка-матэматычных навук У. П.. САЎЧУКУ;

старэйшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «інфармацыйна - вымяральныя сістэмы» кандыдату тэхнічных навук А. У. ПРАКУРАВУ;

старэйшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «інфармацыйна-вымяральныя сістэмы» кандыдату тэхнічных навук У. В. ДАНІЛЕВІЧУ;

старэйшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «радыётэхнічныя прылады і сістэмы» кандыдату тэхнічных навук Л. У. ШАСТАКОВУ;

старэйшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «оптыка» кандыдату фізіка-матэматычных навук А. А. МІНЬКО;

старэйшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «фізічная электроніка, у тым ліку квантавая» кандыдату фізіка-матэматычных навук А. В. СМІРНОВУ;

старэйшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «навуковая арганізацыя і эканоміка працы» кандыдату эканамічных навук А. Р. СКРЫПЧАНКА;

старэйшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «фізічная хімія» кандыдату хімічных навук Л. П. РОГАЧУ;

старэйшага навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці «фізічная хімія» кандыдату хімічных навук Г. І. САМАЛЮ.

Жадаем далейшых поспехаў!

На вашу кніжную паліцу

«Опыт СССР в решении национального вопроса и мир социализма». Так называецца кніга, якую рыхтуе да выхаду ў свет выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Яна прысвечана знамянальнай даце — 60-годдзю ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Аўтар — кандыдат гістарычных навук **Г. С. Марцуль** даследуе гістарычны вопыт СССР па ажыццяўленню ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Усіх, хто займаецца пытаннямі камуністычнага выхавання моладзі і барацьбы супраць буржуазнай ідэалогіі, зацікавіць кніга кандыдата філасофскіх навук **А. М. Байчарова «От «разбитого» поколения к контркультуре (парадоксы молодежного протеста в США)»,** якая таксама выйдзе ў выдавецтве БДУ імя У. І. Леніна.

Не кажы «гоп»...

НЕКАЛЬКІ дзён назад ішоў па калідору галоўнага корпуса універсітэта, і раптам... На спартыўным стэндзе механіка-матэматычнага факультэта аб'ява:

«Усім!

Мы, механікі 2 курса, аб'яўляем сябе лепшымі футбалістамі універсітэта. Хто не згодзен, запрашаем зайсці ў аўдыторыю нумар 353, каб удакладніць час гульні».

Дзёрзка. А раптам?! Хто ведае.

І вось «лепшая» каманда універсітэта 28 лістапада сустрэлася з камандай першага курса факультэта журналістыкі, якая прыняла выклік другакурснікаў мехмата.

Ужо з першых мінут механікі, нібы ў пацвярджэнне сваіх слоў, лавінай рушылі на праціўніка і дабіліся поспеху — 1:0. Але і журфакаўцы не думалі здавацца. Гуляючы ў пачатку ад абароны, яны праз некаторы час самі перайшлі ў атаку, і пасля некалькіх удалых камбінацый лік стаў 1:3 на іх карысць. Праўда, механікам удалося скараціць разрыў, а затым ігракі абедзвюх каманд беспаспяхова штурмавалі вароты саперніка. Гульня так і закончылася —2:3 на карысць журфакаўцаў.

...Я спытаў у футбалістаў мехмата:

— У чым прычына вашага паражэння?

— ???

Адказу не было і не магло быць, бо правільна кажуць: «Не спяшайся заказваць рамку для партрэта, калі маштаб яшчэ не зацікавіліся тваім тварам».

Жадаем поспехаў усім, хто адважыўся назваць сябе лепшымі!

А. ВАЛОШЫН.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

2 снежня 1982 г.

Зак. 2104. АТ 21609

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ